Ф. Скорины, Гомель, 11 июня 2009 года: сб. материалов: в 4 ч. / Гомел. госуд. ун-т им. Ф. Скорины; редкол.: О. М. Демиденко (отв. ред.) [и др.]. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2009. – Ч. 3. – С. 113–115; *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.: манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003. – 233 с.; *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: метадалогія і методыка аналізу / А. Г. Каханоўскі // Российские и славянские исследования: сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2009. – Вып. 4. – С. 44–50; Политические элиты России и Белоруссии: соц. и полит. анализ / С. В. Рогачев [и др.]; Ин-т соц.-полит. исслед.; Рос. акад. наук. – М.; Минск: ИСПИ, 2000. – 109 с.

2. *Долгих, Е. В.* К проблеме менталитета российской административной элиты первой половины XIX века: М. А. Корф, Д. Н. Блудов / Е. В. Долгих. – М.: Индрик, 2006. – 340 с.; *Красовицкая, Т. Ю.* Национальные элиты как социокультурный феномен советской государственности (октябрь 1917–1923 г.): документы и материалы / Т. Ю. Красовицкая; РАН, Ин-т рос. истории. – М.: ИРИ РАН, 2007. – 446 с.; *Марасинова, Е. Н.* Идеологическое воздействие политики самодержавия на сознание элиты российского дворянства второй половины XVIII века: (по материалам законодательства и переписки): автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / Е. Н. Марасинова; РАН, Ин-т рос. истории. – М., 2008. – 51 с.; *Садков, С. М.* Менталитет российской деловой элиты в конце XIX – начале XX в.: философско-культурологический анализ: автореф. дис. … канд. филос. наук: 24.00.01 / С. М. Садков; Гос. ун-т упр. – М., 2001. – 24 с.; *Сергеев, Е. Ю.* Образ Запада в представлениях военной элиты России (1900–1914 гг.): автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.03 / Е. Ю. Сергеев; Ин-т всеобщ. истории РАН. – М., 2001. – 34 с.

3. *Парето, В.* Компендиум по общей социологии / В. Парето // Антология мировой политической мысли: в 5 т. / под ред. Г. Ю. Семигина. – М.: Мысль, 1997. – Т. 2: Зарубежная политическая мысль XX в. – С. 59–67.

4. Адрес-Календарь // Памятная книжка Виленской губернии на 1895 год / Вилен. Губ. Стат. комитет; ред. А. И. Шверубович. – Вильно: Губ. тип., 1894. – 468 с.; Адрес-Календарь // Памятная книжка Витеб. губернии на 1895 год / Витебский Губ. Стат. комитет. – Витебск: Губ. тип., 1895. – 59 с.; Список начальствующих, преподавателей и других лиц, служивших в Литовской Духовной Семинарии в 1828–1878 годах // Сайт Александра Александровича Бовкало [Электронный ресурс]. – 2004. – Режим доступа: http://www.petergen.com/bovkalo/pr/litwaprp.html. – Дата доступа: 27.05.2012.

5. *Вітан-Дубейкаўская, Ю.* Мае ўспаміны / Ю. Вітан-Дубейкаўская. – Вільня: Gudu Kulturos Draugija Lietuvoje, 1994. – 192 с.; *Луцкевіч, А.* За дваццаць пяць гадоў (1903–1928). Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый / А. Луцкевіч. – Мінск, 1991. – 170 с.; *Патоцкі, Л.* Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі; укл., прадм., камент. А. М. Філатавай. – Мінск: Полымя, 1997. – 270 с.; *Щербицкий, О. В.* Воспоминания (1837–1916) / О. В. Щербицкий. – Вильна: Тип. М. А. Дворжеца, 1912. – 22 с.

6. «Всеподданнейший отчет…» виленского, гродненского и ковенского генерал-губернатора П. Д. Святополк-Мирского Николаю II // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – С. 94–116; *Коялович, М.* Состояние православного духовенства на западной окраине России в связи с некоторыми вопросами, касающимися всего русского духовенства / М. Коялович // Литовские епархиальные ведомости. – 1882. – № 46. – С. 376–381; Сборник правительственных распоряжений по устройству быта крестьян-собственников в Северо-Западном крае. – Вильна: Тип. Штаба Вилен. воен. окр., 1864. – 150 с.

**(Дата подачи: 20.02.2015 г.)**



*А. Л. Ягораў*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. L. Yahorau*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476.5)«1797»**

# СЯЛЯНСКІЯ ХВАЛЯВАННІ НА ТЭРЫТОРЫІ ПОЛАЦКАГА НАМЕСНІЦТВА Ў 1797 ГОДЗЕ

# PEASANTS UNREST IN POLATSK VICEGERENCY IN 1797

*Сялянскія хваляванні адбываліся ў студзені-лютым 1797 г. на тэрыторыі Веліжскага, Гарадоцкага, Невельскага, Себежскага і Суражскага паветаў Полацкага намесніцтва. Прычынамі для выступлення сялян былі цяжкія ўмовы існавання, што склаліся пасля масавых раздач іх імператрыцай Кацярынай II расійскім памешчыкам. Таму найбольшым памкненнем сялян стала вяртанне ў склад дзяржаўных. Дапамогу ў пасылцы прашэнняў да Санкт-Пецярбургу і кансультаваннем ім аказвалі святары і іншых саслоўяў людзі. Хваляванні набылі як адносна мірны, так і, радзей, вострапратэстны характар, што абумовіла прымяненне ўладамі для іх падаўлення значнай ваеннай сілы.*

*Ключавыя словы: сялянскія хваляванні; падараванні сялян; Полацкае намесніцтва; святарства; пакаранні.*

*Peasants unrest took place in January-February of 1797 on the territory of Velizh, Haradok, Nevel, Sebezh and Surazh districts of Polatsk vicegerency. The reason forthe peasants protest was hard conditions of their life after the empress Katsiaryna II had massively given them to the Russian landlords. That's why the peasants greatest intention was to become state peasants again. Priests and people of other ranks helped the protesters by consulting them and sending their petitions to Saint Petersburg. The forms of unrest were both peaceful and tangy, that's why the government used significant military forces to suppress this protest.*

*Key words: peasants unrest; presenting of peasants; Polatsk vicegerency; clergy; punishment.*

Са снежня 1796 г. па сакавік 1797 г. на тэрыторыі Расійскай імперыі адбыліся масавыя хваляванні прыгонных сялян. З 41 губерні яны ахапілі 32 [1, с. 284], з іх і Полацкае намесніцтва. Яшчэ ў дасавецкі час М. Ф. дэ Пуле [2] і Я. П. Трыфільеў [1] апісалі гэтыя падзеі ў цэлым і зрабілі спробу патлумачыць іх прычыны, аднак абмінулі пэўныя асаблівасці хваляванняў на Беларусі. У сваю чаргу М. П. Баранава [3] і Е. І. Коранева, нягледзячы на тое, што «сапраўдны навуковы падыход да вывучэння сялянскіх рухаў у нашай краіне стаў магчымы толькі ў савецкі час» [4], амаль не звярнулі ўвагі на ўдзел іншых пластоў насельніцтва, акрамя сялян. Падобны недахопназіраўся і ў даволі значнай манаграфіі В. У. Чапко [5]. Зараз у працах У. А. Сосны падрабязна разглядаецца працэс падараванняў сялян расійскім памешчыкам на Беларусі, які папярэднічаў хваляванням [6], аднак непасрэдна ім адведзена мала месца [7].

Асобныя дакументы аб сялянскіх хваляваннях публікаваліся ў зборніках «Крестьянское движение в России в 1796–1825 гг» [8] і «Хрестоматия

по истории Белоруссии» [9]. Калі з дакументаў першага зборніка можна скласці адносна поўную карціну падзей, то ў хрэстаматыі прыведзены матэрыял для азнаямлення, які носіць адрывісты характар. Асноўная ж маса дакументаў, прысвечаная сялянскім хваляванням у Полацкім намесніцтве, знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску [10].

На Беларусі хваляванні пачаліся 13 студзеня 1797 г., калі сяляне вёскі Прыбыткі, што належала палкоўніку Лазару Тэкелі, заявілі, што не будуць яму падпарадкоўвацца, а самі хочуць запісацца ў казённыя. Палкоўнік не змог іх супакоіць і вымушаны быў з'ехаць у суседнюю вёску [10, а. 1].

Наступным было выступленне ў вотчыне Загараны Гарадоцкага павета – памешчыка Пятра Дрэвіча. Калі ўпраўляючы ўзгадаў пра павіннасці сялян, «то яны сабраліся чалавек да 50 з палкамі, прышлі ў гаспадарскі дом, моцна лаяліся як на самога пана Дрэвіча, так і ўпраўляючаму пагражалі, што калі пан ці яго ўпраўляючы паспрабуюць загадваць, то іх усіх заб'юць, бо яны сабе другога пана маюць» [10, а. 4].

18 студзеня памешчык маёр Яршоў правёў збор сялян у вёсцы Наскова Невельскага павета з-за адмовы плаціць аброк. Туды ён прыехаў з прыходскім святаром і ў адказ на пытанне, чаму яму не плацяць аброк, пачуў, што быццам бы ў Невелі быў зачытаны ўказ, паводле якога сялянам дазволена пісаць скаргі на сваіх памешчыкаў. На спробу святара іх супакоіць, сяляне сказалі, што ўсё роўна плаціць аброк няма чым. Калі маёр Яршоў аднаго з сялян стукнуў, то сяляне закрычалі, што ўсіх не пераб'еш, і маёр вымушаны быў пакінуць вёску [10, а. 8]. У той жа час у ніжні земскі суд паступілі звесткі ад памешчыцы Невельскага павета Дурнавой, што яе сяляне ўзбунтаваліся і сабраліся ў вёсцы Лахнова на нараду [8, с. 64]. Адначасова з гэтым многія сяляне «ходзяць па гораду і павету і шукаюць пісцоў для напісання скаргаў да імператара на сваіх памешчыкаў» [8, с. 65].

20 студзеня ўзбунтаваліся больш за 300 сялян вотчыны Верачча Суражскага павета памешчыка Безбародкі, якія адмовіліся падпарадкоўвацца, забаранілі вінакурэнне, арыштавалі ўпраўляючага і патрабавалі ў яго выдачы памешчыцкіх грошай [10, а. 118].

22 студзеня сяляне невельскага памешчыка Фёдара Патэра адмовіліся яму падпарадкоўвацца, адабралі срэбра, адзенне, коней, скот і іншыя рэчы, а самога пакінулі без харчавання, а пасля і ўвогуле выгналі з дому [10, а. 15].

23 студзеня сяляне надворнага саветніка фон Шыльдэра адмовіліся падпарадкоўвацца ўпраўляючаму [10, а. 15].

Таксама ўзбунтаваліся сяляне памешчыка Рысінскага ў вотчыне Рыкава Себежскага павета і хадзілі па вёсках, «узброеныя напісанай невядома кім просьбай да яго імператарскай высокасці» [10, а. 18].

Сяляне памешчыка паруччыка Мікалая Патэра прышлі да яго ў дом і адабралі грошы і ўсю маёмасць, пагражалі смерцю і трымалі трое сутак пад вартай, а пасля выгналі вон. Памешчыка падпаручыка Івана Сысоева з яго ўпраўляючым сяляне таксама ўзялі пад варту.



На працягу наступных некалькіх тыдняў распачаліся хваляванні сялян у маёнтках графа Сіверса, Варвары Лявонцьевай, генеральшы Радзіной Суражскага павета, генерал-паручыка Нашчокіна, генерал-маёра Івана Германа, Станіслава Бурынскага Себежскага павета, памешчыка Ракасоўскага, генерала Цекуцьева, графа Бурынскага, памешчыка Корсака Гарадоцкага павета, памешчыка Пятра Бабяцінскага, маёра Швыдкоўскага, Міхаіла Сіліцкага, Андрэя і Пятра Істоміных, Тэклі Дараеўскай, калежскай асэсаршы Лускіной, Разаліі Блюмберг і Людвіга Збарожкі Невельскага павета, генерал-лейтэнанта Апухціна, памешчыка Лажкова, памешчыка Сямёна Пагоснава, памешчыцы Мелер-Закамельскай Веліжскага павета і многіх іншых. Усяго бунтуючых у Полацкім намесніцтве было больш за 14 тысяч чалавек [10, л. 237].

На пачатку хваляванняў улады спрабавалі справіцца мясцовымі сіламі. На скаргу палкоўніка Лазара Тэкелі полацкае намесніцкае праўленне загадала дваранскаму засядацелю суражскага ніжняга суда разам з павятовым страпчым адправіцца ў маёнтак палкоўніка і прывесці бунтуючых сялян да падпарадкавання, а пасля на месцы расследаваць, хто быў вінаватым і асудзіць па ўсёй строгасці закона. Дадзенае распараджэнне было выканана і вінаватых вырашана было публічна пакараць. На пакаранне былі прыведзены сяляне з суседніх вёсак з мэтай прадухілення такіх выступленняў. Аднак гэта мела супрацьлеглы эфект – сяляне сталі масава бунтаваць [10, а. 839–839 зв.].

Наступныя спробы супакоіць сялян не прыносілі вялікага плёну. Сяляне памешчыцы Дурнавой пабілі сельскага засядацеля Карэву з сакратаром Антоніям Куксіным і двума салдатамі. У салдат адабралі два ружжы, адзін цясак, два штыкі і патроны. Сяляне адмаўляліся слухацца, пісалі скаргі на памешчыкаў і адпраўлялі ў Санкт-Пецярбург [8, с. 75].

24 студзеня 1797 г. мясцовымі ўладамі быў прыняты ўказ, паводле якога «загадана шатаючыхся па гораду сялян, шукаючых пісцоў для напісання прашэнняў, браць пад варту». Таксама адсылаліся прашэнні ў Санкт-Пецярбург з просьбай арыштаваць сялян, што пайшлі да цара са скаргай [10, а. 235].

26 студзеня намесніцкае праўленне накіравала маёра Рытара, камандзіра полацкай губернскай роты, у Невель, каб адтуль ён адправіўся па месцах бунтаў і там спрабаваў прывесці сялян да паслушэнства «толькі словамі», нікога не караючы, стараючыся не справакаваць больш моцнага бунту. Пасля ўціхамірвання завадатараў належала браць пад варту і адпраўляць ва ўездны суд [8 с. 77].

Аднак маёр Рытар таксама не змог кардынальна паўплываць на сітуацыю ў рэгіёне. 28 студзеня ён прыехаў да бунтуючых сялян, але не змог іх супакоіць, і вымушаны быў вярнуцца ў Невель, адкуль рапартаваў пра неабходнасць значнай колькасці вайскоўцаў для супакаення бунтуючых [8, с. 79].

2 лютага полацкае намесніцкае праўленне выдала інструкцыю для падаўлення бунта, у якой разам з мяркуемым прымяненнем вайсковай сілы рэкамендавалася прыходскім святарам дапамагаць мясцовым уладам у супакаенні сялян [10, а. 41–44].

7 лютага 1797 г. імператар Павел I падпісаў загад пра наданне смаленскаму генерал-губернатару Міхаілу Міхайлавічу Філосафаву асобых паўнамоцтваў для падаўлення паўстання [10, а. 344]. Калі на пачатку лютага 1797 г. полацкае намесніцкае праўленне прасіла па эскадрону на павет, то пасля стала прасіць па тры эскадроны. Да падаўлення паўстання быў прыцягнуты Санкт-Пецярбургскі драгунскі полк на чале з генерал-лейтэнантам Бабарыкіным [5, с. 99]. Разам з мясцовымі сіламі прыходзілася ад батальёна да палка вайскоўцаў на кожны бунтуючы павет Полацкага намесніцтва [5, с. 100].

Дадзенымі сіламі ў трэцяй дэкадзе лютага 1797 г. хваляванні былі падаўлены [10, а. 583–584]. Большасць бунтуючых сялян не аказвала значнага супраціўлення вайсковым камандам. Так, зброя, адабраная ў салдат сялянамі памешчыцы Дурнавой, не прымянялася супраць вайскоўцаў і была спакойна вернута назад [10, а. 15]. Вайсковыя каманды размяшчаліся ў бунтуючых маёнтках і пасля пакарання зачыншчыкаў пераходзілі да наступнага маёнтка. Уяўленне пра паводзіны вайскоўцаў дае скарга памешчыцы себежскага павета Ганны Яфімавай на земскага капітана-іспраўніка Корсака, які па прычыне асабістай непрыязі да памешчыцы і яе мужа размясціў на кватэрах у яе маёнтку некалькі эскадронаў салдат з абозамі. «Так, у кожным сялянскім доме месціцца па некалькі салдат. Яны, мабыць па навучанню Корсака, б'юць сялян, руйнуюць іх маёмасць, заяўляюць, што яны прысланы ў вёску для супакаення бунта, якога ніколі тут не было» [10, а. 967].

Аднак былі выпадкі моцнага супраціўлення вайскоўцам. Так, 13 лютага ў маёнтку Рыкава з'явіўся маёр фон Гельдэ з больш чым сотняй салдат. Сяляне адмовіліся прымаць іх на кватэры. На наступны дзень быў арыштаваны завадатар бунта Коршун. У адказ на гэта сабралася каля 500 сялян, якія і адбілі свайго лідара. Супакоіць іх змагла толькі новая вайсковая каманда з двухсот чалавек [8, с.68].

16 лютага ў маёнтак памешчыцы Мелер-Закамельскай прыбыў вайсковы атрад. Яго сустрэў натоўп сялян. Яны не пагаджаліся падпарадкавацца памешчыцы. «У гэты самы час да натоўпа бунтуючых (600 чалавек) падышоў мешчанін горада Веліжа Максім Турык, які падахвочваў іх стаяць у сваім бунце і крычаў, што ўказы выдуманыя і фальшывыя, а ёсць адзін указ пра сялянскую вольнасць». Мешчаніна схапілі, і салдаты стаялі перад сялянамі 24 гадзіны з прымкнутымі штыкамі, «як супраць непрыяцеля» [10, а. 861].

Аднак такія вострыя супрацьстаянні былі хутчэй выключэннем, чым правілам. Пасля падаўлення бунта пачалі працаваць следчыя камісіі, якія выяўлялі прычыны і ступень удзелу ў ім сялян і людзей рознага стану, вызначалі пакаранні.



Прычынамі для выступлення сялян былі цяжкія ўмовы існавання. Сяляне скардзіліся на цяжкую паншчыну: «Дзень і ноч на ёй працуем і сваіх дамоў не знаем, вялікія паплаты зусім нас загубілі, прыйшло нам цяжкае спусташэнне, каманды на нас насылае (памешчык. – *А. Я.*), мужыкоў страляе» [10, а. 625], «абцяжарвае ўпраўляючы вотчынай» [10, а. 915 зв.]. Акрамя таго, ў якасці прычын узгадваліся наступныя моманты: «Піліп і Паўлюк Захаравы казалі, што калі не будзем пісаць просьбу імператару, то будуць сячы смертнаю пугаю і ноздры рваць» [10, а. 720], «… бо чулі, што калі хто не будзе просьб, таго пакараюць…» [10, а. 721], «не падпісаўшых прашэнне павесяць» [10, а. 840], «прайшоўшая чутка, што імператар пры ўступленні на трон выарашыў усіх памешчыцкіх сялян запісаць у казённыя, а хто не падасць прашэнне аб пераводзе імператару, то старыя сяляне будуць пакараны пугаю, а маладыя будуць узяты ў рэкруты» [10, а. 915 зв.]. Адной з прычын для непадпарадкавання было няправільнае талкаванне ўказа Паўла I ад 12 снежня 1796 г., які забараняў падпісваць прашэнні на імя імператара больш чым аднаму чалавеку.

Згодна з паказаннямі сялян бунт у розных маёнтках праходзіў прыкладна па адной схеме: сяляне, пачуўшы пра магчымую волю, збіраліся на нараду ў карчме ці ў кагосьці дома, прымалі рашэнне пра бунт, збіралі аднавяскоўцаў, ішлі да гаспадарскага дома, арыштоўвалі ўпраўляючага ці памешчыка, часам забіралі з гаспадарскага дома пэўную маёмасць і грошы. Пасля шукалі пісара, які мог бы напісаць прашэнне імператару. Адпраўлялі хадакоў у Санкт-Пецярбург і чакалі іх вяртання. Падчас гэтага яны стараліся пазбавіцца ад ненавісных павіннасцей: здымалі дзясятнікаў [10, а. 843], закрывалі вінакурні [10, а. 118].

Праблемай для паўстаўшых сялян было знайсці пісара, бо пісьменных людзей сярод іх амаль не было [3, с. 14], а за напісанне скаргаў да імператара пісцу пагражала біццё пугаю і адпраўленне на катаргу [10, 841–841 зв.]. Так, гарадскому сакратару Ануфрыю Міхайлаву сяляне вотчыны Вышадкі за напісанне прашэння на імя цара далі 10 рублёў і 11 фунтаў мёду [10, 701–701 зв.]. Гарадзецкі мешчанін Восіп Андрэеў пісаў прашэнне на імя цара па няведанню, бо быў п'яны, і за працу ад сялян нічога не ўзяў [10, а. 716]. «Шляхціч Іосіф Пашкевіч пісаў просьбы сялянам розных памешчыкаў. Раіў усім заставацца ў падпарадкаванні сваім гаспадарам, і ў вотчынах, чые сяляне пісалі ў яго прашэнне, ніякага рабунку не было» [10, а. 792].

Падчас хваляванняў па абодва бакі барыкадаў апынуліся святары. З аднаго боку, яны адыгралі вялікую ролю ў супакаенні сялян. Так, протаіерэй Васіль Івашын, «нягледзячы на пагрозы і лаянку сялян, неаднаразова хадзіў у сярэдзіну буйнага натоўпу і ўгаворваў пастарскім словам да падпарадкавання ўладам…» [10, а. 862 зв.]. З другога – асноўнымі «рухавікамі» сялянаў

таксама з'яўляліся святары, якія не толькі пісалі прашэнні ад іх імя, але і давалі парады, як лепей дзейнічаць. Так, праваслаўны святар Далжанскай царквы Невельскага павета Лявонцій Славецкі замест супакаення засведчыў прашэнне сялян да імператара і даў ім падарожную ў Санкт-Пецярбург [10, а. 638]. Святар уніяцкага прыхода Аболі Павел Шыбека ў напісанай ім сялянскай скарзе да імператара замест іх распісаўся, а калі камісія, што расследавала бунт, загадала сялянам з'явіцца на гаспадарчым падвор'і, раіў ім адзін аднаго не выдаваць, супраць салдат не ўзбройвацца, а зачыншчыкам казаў не ісці да ўлад, пакуль яны самі не паклічуць [10, 683 зв.]. Святар уніяцкага прыхода Мяхоўскага Рыгор Вячэрскі напісаў прашэнне сялянам воласці Абольскай да імператара [10, а. 864]. Праваслаўны святар пагоста Трэхалёва Тарасій Махальскі раіў сялянам пісаць скаргі на памешчыка генерала Міхельсона, казаў ім: «Трымайцеся моцна, я з вамі і падпішу вашу просьбу» [10, а. 791], абяцаў даць ад сябе падарожную, калі не дастануць самі, гаварыў упраўляючаму вотчыны Дванова, што «я не ў яго камандзе стаю, а маю сваіх духоўных настаўнікаў». Сялянам раіў: «Не бойцеся, стойце смела і моцна, і патрабуйце ад упраўляючага рэкруцкіх грошай» [10, а. 791 зв.].

У прашэннях на імя імператара сяляне скардзіліся на сваё становішча і кляліся «шчыра і верна, да апошняй кроплі крыві служыць вялікаму гасудару… і ўсе жадаем на вялікага гасудара запісацца» [10, а. 625].

Аднак іх надзеі не спраўдзіліся, і камісіі пасля правядзення следства судзілі большасць сялян на месцы. Асноўнымі злачынствамі лічыліся: адмова падпарадкоўвацца, паездка для напісання скаргі, прапанова ўзяць гаспадарскія грошы, ілжыва назваўся войтам, ездзіў даставаць пашпарт, кіраваў натоўпам, распаўсюджваў ілжывыя чуткі, жаданне ехаць у Санкт-Пецярбург, быў начальнікам [10, а. 725–726 зв.] і г. д.

Камісія выказвала пажаданні, як таго ці іншага бунтаўшчыка караць, аднак канчатковае рашэнне было за памешчыкам і вайсковым кіраўніцтвам [10, а. 761, 841 зв]. Аб характары і маштабах пакаранняў дае ўяўленне табліца 1 [10, а. 981–983]:

*Табліца 1*

**Характар і маштабы пакаранняў бунтуючых**

| Колькасць пакараных па паветах | Від пакарання | | | | Атасланы ў крымінальную палату | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | пугай | бізуном | батагамі | палкамі | | |
| Невельскі | 3 | 74 | 10 | 1 | 8 | 96 |
| Веліжскі | 10 | 22 | 23 | - | 13 | 68 |
| Гарадоцкі | 2 | 3 | 16 | - | 2 | 23 |
| Суражскі | 11 | 78 | 410 (262 лозамі) | - | 7 | 506 |
| Себежскі | 1 | 52 | 107 | - | - | 160 |
| Усіх | 27 | 229 | 566 | 1 | 30 | 853 |



Адносна канкрэтных удзельнікаў гэта выглядала так: «Царкоўнага старасту Цераха Парфёнава за прывядзенне сялян да прысягі – 18 удараў пугаю»; «Аляксандра Фядотава, пісаўшага просьбу сялянам на імя імператара… хаця ён здзейсніў злачынства, вартае ссылкі, аднак рабіў яго без усякага ўмысла і не маючы ніякіх відаў, да прытым п'яны, камісія вырашыла пакараць яго бізуном» [10, а. 726 зв.]; «Невельскага мешчаніна Я. Лейбовіча, за саўдзел з сялянамі ў бунце, бо вёз ад іх віно гаспадарскае, грошы за гэта ім аддаў. Неміласэрна пакараны батагамі» [10, а. 794]; вышэйзгаданы Максім Турык быў пакараны шпіцрутэнамі праз 400 чалавек паўтары разы [10, а. 899]; селянін Андрэй Цімафееў быў пакараны 50 ударамі бізуном, выразаннем наздрэй і пастанаўленнем на твары знакаў і ссылкай на катаргу, аднак па дарозе ў Сураж ад атрыманых раненняў памёр [10, а. 1020, 1022].

У «бунце» прынялі ўдзел 8 праваслаўных і ўніяцкіх святароў. 7 з іх былі адпраўлены ў крымінальную палату для далейшага расследавання. Святар Васіль Максімаў уцёк. Усяго ў крымінальную палату адпраўлены 30 чалавек. Сярод іх былі шляхціч [10, а 792], адстаўны прапаршчык, панцырны баярын [10, а. 645], канцэлярысты і г. д. У параўнанні з асноўнай масай пакараных (853 чалавекі) гэта складае менш 4 %, аднак менавіта яны часта ўплывалі на развіццё сялянскіх хваляванняў.

Па-за паўстаннем, згодна з падлікамі Трафільева, апынуліся наступныя губерні: Архангельская, Астраханская, Вятская, Курляндская, Літоўская, Мінская, Падольская, Слабодска-Украінская, Эстляндская. У Архангельскай губерні паводле 5-й рэвізіі (1796 г.) прыгонных было 65 душ, у Астраханскай іх увогуле не было, а ў Вятскай – толькі 8099 душ [1, с. 285]. Гісторык пакідае без адказу пытанне, чаму іншыя шэсць губерняў не ўзбунтаваліся. Падобнае пытанне ўзнікала і ў дэ Пуле: «Заўважана, што ў Літве і ў астатняй Беларусі, нядаўна далучаных, у той жа самы час, калі ў адным з гарадоў першай у Гродна яшчэ знаходзіўся былы польскі кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі з цэлым прыдворным штатам, – у тагачасных губернях Літоўскай і Мінскай, па сведчанню таго ж Філасафава, нідзе нічога няма, і супраць імператара нідзе нічога не адкрыта» [2, с. 545–546].

Адносна заходніх, цэнтральнабеларускіх і літоўскіх земляў адказ падаецца даволі простым: 4 з 6 губерняў, дзе не бунтавалі, былі створаны ў 1793–1797 гг. (Літоўская, Мінская, Падольская, Курляндская), і іх насельніцтва яшчэ не паспела адчуць усе сацыяльныя і палітычныя наступствы ўключэння ў Расійскую імперыю, у той час як усходняя Беларусь была ўжо больш за 20 год пад уладай царскага ўрада і расійскіх памешчыкаў. Беларуская губерня, якая ўключыла ў сябе Полацкае намесніцтва, налічвала 41 адно сялянскае выступленне за пачатак 1797 г., больш толькі ва Уладзімірскай губерні. Менавіта на ўсходнебеларускіх землях Кацярынай ІІ была раздадзена найбольшая колькасць сялян, якія да першага падзелу Рэчы Паспалітай з'яўляліся каралеўскімі эканамічнымі і старосцінскімі [6, а. 103]. Таму мары сялян пра вяртанне ў стан казённых

можна адносіць да імкнення вяртання парадкаў часоў Рэчы Паспалітай, пра якую памятала старэйшае пакаленне.

Вышэйазначанае дае магчымасць разглядаць дадзеныя сялянскія хваляванні як супольнае выступленне ніжэйшых пластоў насельніцтва Полацкага намесніцтва супраць прыгнёту расійскіх землеўладальнікаў. Як пісаў у сваім данясенні полацкаму намесніцкаму праўленню веліжскі суддзя Рэўт, «сяляне жадалі, каб быць вольнымі» [10, а. 831].

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Трифильев, Е. П.* Очерки из истории крепостного права в России / Е. П. Трифильев. – Харьков: Тип. «Печат. дело», 1904. – 361 с.

2. *Де-Пуле, М. Ф.* Крестьянское движение при императоре Павле Петровиче / М. Ф. Де-Пуф // Русский архив. – СПб., 1869. – Вып. 3. – С. 525–577.

3. *Баранова, М. П.* Крестьянское движение в Белоруссии в конце XVIII и начале XIX в.: автореф. дис. … канд. ист. наук / М. П. Баранова. – Минск, 1953. – 18 с.

4. *Коренева, Е. И.* Крестьянское движение в России в 1796–1798 гг. Московский ордена Ленина государственный университет имени М. В. Ломоносова: автореф. дис. … канд. ист. наук / Е. И. Коренева. – М., 1954. – 16 с.

5. *Чепко, В. В.* Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века / В. В. Чепко; АН БССР, Ин-т истории. – Минск: Наука и техника, 1972. – 265, [2] с

6. *Сосно, В. А.* К вопросу о причинах пожалований крестьян в Белоруси в 70–90-е годы XVIII века / В. А. Сосно // Сельское хозяйство и крестьянство Беларуси (материалы научной конференции, 27–29 октября 1989 г., Гомель). – Минск, 1991. – С. 100–107.

7. *Сосна, У. А.* Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / У. А. Сосна. – Мінск: БДУ, 2000. – 115 с.

8. Крестьянское движение в России в 1796–1825 гг.: сб. док. / сост.: З. И. Кудрявцева, Э. С. Паина, Н. Ф. Сорокина; введ. Н. Дружинина; под ред. С. Н. Валка. – М.: Соцэкзиз, 1961. – 1048 с.

9. Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времён до 1917 г.: учеб. пособие для студентов ист. фак. вузов республики / сост.: А. П. Игнатенко, В. Н. Сидорцов; под ред. П. З. Савочкина. – Минск: Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1977. – 469,[1] с.

10. Дело о волнении крестьян Суражского, Невельского, Себежского, Велижского, Городоцкого и Полоцкого уездов Полоцкого наместничества 20 января 1797 г. – 15 июля 1799 // Нац. гіст. архіў Беларусі. – Фонд 2567. – Воп. 1. – Спр. 220. – 1144 арк.

**(Дата подачи: 20.02.2015 г.)**

*В. И. Яковчук*
Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Минск
*V. I. Yakovchuk*
Academy of management at the President of Republic of Belarus, Minsk

**УДК 93/328**

# СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ СИСТЕМЫ ГОСУДАРСТВЕННОГО УПРАВЛЕНИЯ ПРЕДУПРЕЖДЕНИЕМ И ЛИКВИДАЦИЕЙ ЧРЕЗВЫЧАЙНЫХ СИТУАЦИЙ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ



# FORMATION AND DEVELOPMENT OF SYSTEM OF PUBLIC ADMINISTRATION BY THE PREVENTION AND ELIMINATION OF EMERGENCY SITUATIONS IN REPUBLIC OF BELARUS

*В статье исследуются исторические аспекты становления и развития системы государственного управления предупреждением и ликвидацией чрезвычайных ситуаций после обретения Беларусью независимости. Рассматриваются процессы нормативно-правового и организационного обеспечения системы предупреждения и ликвидации чрезвычайных ситуаций, становление и развитие спасательных подразделений, деятельность органов государственной власти по обеспечению природной и техногенной безопасности в населенных пунктах, на предприятиях и в организациях Республики Беларусь.*

*Ключевые слова: государство; пожар; система; управление; чрезвычайная ситуация.*

*In article historical aspects of formation and development of system of public administration by the prevention and elimination of emergency situations after finding of independence by Belarus are investigated. Processes of standard and legal and organizational support of system of the prevention and elimination of emergency situations, formation and development of saving divisions, activities of public authorities for ensuring natural and technogenic safety in settlements, at the enterprises and in the organizations of Republic of Belarus are considered.*

*Key words: state; fire; system; management; emergency situation.*

На протяжении своей истории общество постоянно подвергается воздействию различных чрезвычайных ситуаций природного и техногенного характера (далее – ЧС). Они уносят тысячи человеческих жизней, наносят колоссальный экономический ущерб, в мгновение ока разрушают все то, что создавалось годами, десятилетиями и даже веками. ЧС становятся все более частыми и масштабными. Они способны подорвать не только экономику, но и поставить под угрозу безопасное проживание людей на огромных территориях, вызвать социально-экономическую нестабильность. Общество становится все более зависимым от техносферы – ее разрушение равносильно катастрофе, а бесконтрольный, неограниченный рост ее приводит зачастую к деградации окружающей среды. Многие ЧС оказали судьбоносное влияние на цивилизации, и уязвимость человечества для них повышается. Развернувшаяся в XX в. беспрецедентная по масштабам инженерная деятельность, вызванные ею изменения природной среды резко увеличили вероятность возникновения ЧС, которые всегда представляли и сегодня представляют собой одну из существенных внутренних угроз национальной безопасности любой страны мира. Защита от них относится к числу наиболее острых проблем общества и государства. Сегодня нет ни одной страны, перед которой не стоял бы вопрос о защите от ЧС, и нет ни одного государства, которое могло бы решить эту проблему в полном объеме.

После обретения независимости молодое белорусское государство очень остро ощутило наличие этой проблемы. Весомую долю среди ЧС занимали пожары. Пожарная статистика последнего советского десятилетия убедительно подтверждала необходимость реформирования системы по-